# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА "Рух "За Свабоду". Выпуск № 9 верасень 2011

***Змены ў кіраўніцтве Руху "За Свабоду"* – с. 2**

***Неафіцыйная амбасада Беларусі ў Польшчы* – с. 3**

***"Усходняе партнёрства" дае аванс* – с. 6**

***Рублёвыя шпалеры* – с. 7**




Мікіта Ліхавід зняў свой партрэт з шэрагу фотаздымкаў палітзняволеных у памяшканні Камітэта абароны рэпрэсаваных "Салідарнасць"

# Мікіта Ліхавід на волі!

**Гэты юнак, кінуты за краты за ўдзел у акцыях пратэсту супраць фальшавання выбараў напрыканцы мінулага года, прадэманстраваў небывалую мужнасць, прынцыповасць і няскоранасць. Ва ўмовах турэмнага зняволення, уся сістэма якога накіраваная на тое, каб прынізіць і зламаць волю чалавека, Мікіта Ліхавід адкрыта заяўляў, што з'яўляецца незаконна асуджаным. Чым больш на яго ціснулі фізічна, ускладняючы і без таго жорсткія ўмовы ўтрымання, тым больш яго паважалі атачэнцы. Ён не прасіў літасці ў гэтай улады. Факт ягонага вызвалення – сапраўднае сведчанне перамогі сілы духу.**

***Матэрыял пра Мікіту чытайце на с. 4-5***

ЕЎРАІНТЭГРАЦЫЯ

## Добрыя беларусы

**Сацыялагічны цэнтр «Люстэрка-інфа» распытаў беларусаў у гарадах аб іх стаўленні да шэрагу дзяржаў.**

Па словах сацыёлагаў, першае, што паказала апытанне, – гэта пераважна станоўчае стаўленне рэспандэнтаў да ўсіх прапанаваных для ацэнкі краін. Так, тры чвэрці апытаных "вельмі добра" або "у асноўным добра" ставяцца да Расіі (75%) і да Украіны (73%). Дзве траціны рэспандэнтаў пазітыўна ставяцца да Германіі (68%), да Еўрапейскага Саюза (65%) і да Польшчы (64%). Больш за палову – 56% – беларусаў "вельмі добра" або "у асноўным добра" ставяцца да ЗША.

Узнікае пытанне: на падставе чаго ў людзей фармуюцца такія думкі? Толькі дзякуючы паведамленням СМІ ці ёсць і іншыя каналы, шляхі станаўлення ў нашых суайчыннікаў добрых пачуццяў да прадстаўнікоў іншых дзяржаў і нацый?

Таму ў беларусаў даведаліся і пра тое, былі ці не былі яны за мяжой (у краінах далёкага замежжа і ў краінах СНД) на працягу апошніх 5 гадоў.

Апынулася, што больш за палову – 59% апытаных – на працягу апошніх 5 гадоў пабывалі ў краінах СНД. А каля траціны (32%) за мінулую пяцігодку наведалі краіны далёкага замежжа.

**Працяг на с.6**

# Змены ў кіраўніцтве Руху "За Свабоду"

**Віктар Карнеенка напісаў заяву аб спыненні паўнамоцтваў намесніка старшыні арганізацыі "у сувязі з разыходжаннем поглядаў на стратэгію і тактыку дзейнасці". Але ён застаецца ў Руху.**

Старшыня Руху "За Свабоду" **Аляксандр Мілінкевіч** выказаў шкадаванне з прычыны яго адыходу ад кіраўніцтва:

*– Бо нас звязваюць не толькі сумесная шматгадовая праца на карысць дэмакратыі, але і сяброўства. Віктар Карнеенка – таленавіты і перспектыўны палітык быў і застаецца. Веру, што нягледзячы на сённяшнюю розніцу ў пэўных падыходах, мы ў стане з ім зрабіць яшчэ шмат добрага на карысць краіны. Бо нас яднаюць аднолькавыя каштоўнасці.*



Рух "За Свабоду"– гэта грамадска-палітычная арганізацыя. У аўтарытарнай дзяржаве я лічу такую форму аб'яднання найбольш аптымальнай.

Спрэчныя моманты па стратэгіі і тактыцы такія:

*– Сёння Рух "За Свабоду" – гэта грамадска-палітычная арганізацыя. У аўтарытарнай дзяржаве я лічу такую форму аб'яднання найбольш аптымальнай. Наша грамадская задача – еўрапеізацыя Беларусі праз адукацыйныя, інфармацыйныя, аналітычныя праекты, праз спрыянне самарганізацыі грамадства і фармаванне будучай эліты. Наша палітычная мэта – адстойванне незалежнасці краіны, права беларусаў на свабодныя выбары. Віктар бачыць у Руху перш за ўсё палітычную структуру, партыю. Ён заўсёды быў перш за ўсё палітыкам. На ягоную думку, грамадскія праекты мусяць быць не самастойнымі, а падпарадкоўвацца палітычным задачам. Большасць жа ў Радзе Руху лічыць абодва накірункі дзейнасці самакаштоўнымі і ўзаемадапаўняльнымі.*

Ці значыць, што Рух "За Свабоду" не збіраецца станавіцца партыяй, а застанецца і НДА, і палітычнай структурай адначасова?

*- Сёння ў Беларусі няма рэальных умоваў для дзейнасці партый: няма рэальных выбараў і адкрытай палітычнай канкурэнцыі,* – кажа Аляксандр Мілінкевіч. *– Партыі не ў стане лабіяваць інтарэсы сацыяльных груп. Але цяперашняя ўладная сістэма безнадзейна састарэла. І, як толькі ў нас з'явяцца ўмовы для развіцця партый, сябры Руху, якім цікавая палітычная дзейнасць, разам з іншымі прабеларускімі і праеўрапейскімі палітыкамі, маю надзею, створаць моцную правацэнтрысцкую партыю. Рух пры гэтым ужо не будзе выконваць палітычных функцый і застанецца грамадскім аб'яднаннем, бліжэйшым партнёрам такой партыі.*

**Віктар Карнеенка** патлумачыў, чаму сышоў з кіраўніцтва Руху, у СМІ тым, што сёння трэба больш актыўна займацца палітыкай, а не асветніцкай і экспертнай дзейнасцю:

*– Я лічу, што сёння, калі ў краіне такая сацыяльна-эканамічная сітуацыя, калі людзі па-іншаму ацэньваюць уладу і шукаюць ёй альтэрнатыву, усе адказныя людзі і структуры (нельга ж казаць, што Мілінкевіч грамадскі дзеяч, а не палітык – чалавек жа балатаваўся ў прэзідэнты) павінны якраз працаваць з людзьмі, а не займацца асветніцтвам ці экспертызамі на далёкую-далёкую перспектыву.*

Карнеенка кажа, што надалей працягне дзейнічаць у рамках Аб'яднанай грамадзянскай партыі, з якой ён не выходзіў. Разам з тым ён адзначае, што не бачыць у сённяшняй Беларусі ніводнай самадастатковай палітычнай структуры, якая можа самастойна ўплываць на палітычную сітуацыю. Таму выйсце ён бачыць у кансалідацыі.

Намеснік кіраўніка Руху "За Свабоду" **Юрась Губарэвіч**, каментуючы сітуацыю ў інтэрв'ю Еўрарадыё, сказаў, што не лічыць сыход Віктара Карнеенкі з кіраўніцтва арганізацыі разладам у ёй:

*– У нас у Беларусі сітуацыя такая закансерваваная, не толькі ва ўладзе, але і ў апазіцыі, што сыход аднаго з лідараў адной з арганізацыяў успрымаецца як вельмі важная падзея. Насамрэч, гэта звычайны працэс. Людзі схільныя да пэўнага развіцця, да змены сваіх думак, у тым ліку, да пэўнай нязгоды з той лініяй, якую праводзіць арганізацыя, таму яны маюць права выбіраць, дзе яны будуць рэалізоўваць свой патэнцыял.*



Усе адказныя людзі і структуры павінны якраз працаваць з людзьмі, а не займацца асветніцтвам ці экспертызамі на далёкую перспектыву.

У адказ на словы Карнеенкі пра тое, што Рух "За Свабоду" не займаецца палітычнай дзейнасцю, Губарэвіч лічыць, што арганізацыя не займаецца імітацыяй палітычнай дзейнасці:

*– Сёння немагчыма рэалізаваць сябе ў выбарчых кампаніях, бо яны праводзяцца недэмакратычна, з прадказальным фіналам. Рух "За Свабоду" абірае тыя рэчы, якія можна рэалізаваць ужо сёння і зараз у Беларусі, якія, натуральна, будуць мець важнае значэнне і зараз, і на перспектыву, таму я не бачу ніякага грунту пад падобнымі прэтэнзіямі.*

Абранне новага намесніка кіраўніка Руху "За Свабоду" мусіць адбыцца на з'ездзе арганізацыі, дата правядзення якога пакуль невядомая.



# Неафіцыйная амбасада Беларусі ў Польшчы

**У Варшаве ствараецца Беларускі дом – арганізацыя, якая ставіць за мэты аб’яднаць тамтэйшых беларусаў праз кансультацыйную дапамогу, арганізацыю супольных акцый, культурных мерапрыемстваў і лабіяванне іх інтарэсаў у польскім грамадстве.**

*“Каб дапамагчы суайчыннікам знайсці сябе ў новым жыцці, адаптавацца і легалізавацца. Другі блок дзейнасці – стварэнне кам’юніці беларусаў, што жывуць у Варшаве. Нам важна быць разам. Трэці блок – гэта месца, дзе будуць ладзіцца розныя мерапрыемствы. Чацвёртае – лобінг нашых інтарэсаў у польскім грамадстве, якое вельмі салідарнае з Беларуссю. Важна, каб Беларусь была ў еўрапейскай арбіце і каб польская, варшаўская суполка беларусаў працавала таксама на карысць дэмакрычных зменаў на Радзіме*”, – распавядае пра Беларускі дом яго заснавальнік, сябра Рады Руху “За Свабоду” **Алесь Зарэмбюк**, які быў вымушаны з’ехаць у Польшчу пасля завядзення супраць яго крымінальнай справы за актыўную апазіцыйную дзейнасць.

Знайсці Беларускі дом можна па адрасе: Варшава, ул. Вейска 13/3 (ul. Wiejska 13/3 00-480 Warszawa; Polska). Скрыня для допісаў – **bel.house.warsaw@gmail.com.**

# Выбары ў парламент пройдуць па-старому

**Апошняя магчымая дата парламенцкіх выбараў у Беларусі – 23 верасня 2012 года, паведаміла кіраўніца Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. Пасля нядаўніх заяваў аб магчымасці пераўтварэння “Белай Русі” з грамадскага аб’яднання ў палітычную партыю (“партыю ўлады”) зноў паўстала тэма, звязаная з пераходам да змешанай або прапарцыйнай сістэмы выбараў.**

Ярмошына заявіла, што “*бліжэйшыя выбары пройдуць па дзейсным выбарчым заканадаўстве і ў бліжэйшай перспектыве пераход на прапарцыйную сістэму нам не пагражае. Усё ж такі пераход на іншую сістэму патрабуе сур’ёзнай палітычнай дыскусіі ў грамадстве, уліку грамадскай думкі. Калі грамадства занятае зусім іншымі праблемамі і ўсіх цікавіць больш эканамічныя рэаліі, дыскусія на палітычную тэму можа раззлаваць выбаршчыкаў*”.

Заявы кіраўніцы Цэнтрвыбаркама, якія апынуліся дастаткова прадказальнымі, пракаментаваў намеснік старшыні Руху “За Свабоду” **Юрась Губарэвіч**:

“*Рашэнне аб форме і метадах правядзення парламенцкіх выбараў будзе прымацца палітычным кіраўніцтвам краіны, зыходзячы з кан’юнктурнага моманту. Ярмошына будзе паінфармаваная аб гэтым рашэнні і павінна будзе выканаць адведзеную ёй ролю.*

*Зрэшты, сам па сабе пераход з мажарытарнай выбарчай сістэмы на прапарцыйную ці змешаную нічога не мяняе, калі будуць захаваныя механізм фальсіфікацый выбараў і няроўныя ўмовы палітычнай барацьбы. У прыватнасці, калі апазіцыйныя сілы па-ранейшаму не будуць мець магчымасці папулярызаваць свае погляды праз дзяржаўныя СМІ*”.

# Другі сезон маўклівых пратэстаў

Кампанія “Рэвалюцыя праз сацыяльную сетку” абвясціла другую хвалю маўклівых акцый пратэсту ў цэнтрах гарадоў. Пакуль малалюдна – нават нягледзячы на агучванне сацыяльных, эканамічных і палітычных патрабаванняў да ўладаў, чаго не было ўлетку.

Лідар гомельскай абласной арганізацыі Руху “За Свабоду” **Пётр Кузняцоў**, які браў актыўны ўдзел у летніх акцыях і аналізаваў іх у СМІ, кажа:

“*Думаю, што працяг*



Акцыя 21-га верасня ў Мінску

*“маўклівых акцый” сутыкнецца з шэрагам аб’ектыўных праблем, якія не былі вырашаныя яшчэ, скажам так, у мінулым сезоне. Па вялікім рахунку, заняпад тады адбыўся не столькі нават з-за рэпрэсій уладаў, колькі таму, што людзі страцілі веру ў поспех кампаніі і ў здольнасці яе арганізатараў. Хадзіць на акцыі стала, працэй кажучы, бессэнсоўна. Шанец на адраджэнне ёсць толькі пры ўмове, калі арганізатарам удасца гэтую самую веру вярнуць. З гэтага пункту гледжання, першыя акцыі пасля “адпачынку” будуць і самымі цяжкімі, і самымі адказнымі, і самымі вызначальнымі*”.



*Я на “зоне” казаў усё, што думаў. Быў вольны. Па вялікім рахунку, мяне на “зону” не пасадзілі”.*

# Герой змрочнага часу

Выпушчаны з Навапалацкай калоніі актывіст Руху “За Свабоду” Мікіта Ліхавід кажа, што хоча жыць далей сваім звычайным жыццём, а палітыкай ён не займаецца, а таму палітычных планаў не мае. Тым не менш, менавіта гэты 21-гадовы хлопец стаў адным з герояў гэтага года – прынамсі, для тых, хто супраць таго, што чыніцца ў Беларусі уладамі.

Цяпер Мікіта Ліхавід набірае страчаныя ў зняволенні 17 кілаграмаў і высыпаецца.

“*Усё, што адбываецца цяпер, натуральна, успрымаецца, праз прызму 9 месяцаў у зняволенні. Я сам асабліва не змяніўся, але тое, што раней здавалася штодзённым, звычайным, зараз уяўляецца па-іншаму – больш важным і каштоўным*”, – кажа Мікіта.

Нагадаем, Мікіта Ліхавід адмовіўся ў калоніі прытрымлівацца тамтэйшага распарадку, бо быў асуджаны незаконна. За гэтую цвёрдую пазіцыю ён адседзеў 81 суткі ў штрафным ізалятары, а затым быў зачынены ў памяшканне камернага тыпу.

Ліхавід не адступіўся: *“І ўгаворванні былі. Але я вырашыў яшчэ ў Жодзіне, што буду сядзець менавіта так, а не інакш. Выхад на волю? Мабыць, для таго, хто напісаў прашэнне аб памілаванні, гэта было моцным аргументам. Вядома, волі вельмі хочацца, але воля – гэта ж не магчымасць смачна паесці. Вось мы п’ём зараз гарбату на волі, але гэта ж не значыць, што мы цалкам вольныя!? Я на “зоне” казаў усё, што думаў. Быў вольны. Па вялікім рахунку, мяне на “зону” не пасадзілі”.*

У сваіх успамінах Мікіта не геройнічае: нават кажа, што ў штрафны ізалятар нядрэнна было трапляць для змены атмасферы – адпачыць ад “зоны”: “*Можна сядзець годна. Я сустракаў там людзей, якія сядзяць у ШІЗА па паўгода-год. Ціснулі, ламалі ў адміністрацыі не наўпрост – у асноўным імкнуліся падставіць так, каб на мяне настроіліся іншыя зняволеныя. Гэта звычайная практыка там: разбіваць зняволеных на групоўкі і нацкоўваць адно на аднаго. Зрэшты, былі людзі, якія сядзелі ў*



Мікіта Ліхавід на судзе 22 сакавіка



Мікіта з маці Аленай Ліхавід




Мікіта Ліхавід з паплечнікамі





Маці Мікіты па выхадзе з Акрэсціна



Мікіта распавядае пра “зону”

*іншых калоніях, якія распавядалі аб пастаянных жорсткіх збіццях*”.

У апошнія дні перад вызваленнем яго ўгаворвалі напісаць прашэнне аб памілаванні: «*Маўляў, ёсць законны спосаб выйсці. Казалі, што вось усіх выпусцяць, а ты застанешся сядзець. Ну і што? Галоўнае – каб родныя памяталі!*».

Злосці на адміністрацыю калоніі ў Наваполацку не трымае: “*Такая сістэма. Кругавая парука. І начальнік калоніі нічога не можа зрабіць, нават калі захоча. Інакш сістэма зжарэ яго. На кожнага ёсць кампрамат: быў у пагонах – будзеш з біркай хадзіць*”.

“Зона” – згустак негатыву: пацукі, смярдзючы хлеб, некваліфікаваная меддапамога... Дарэчы, аднаго з лекараў санчасткі, па словах актывіста, зняволеныя называлі Доктарам Зло, Доктарам Смерць. Прыклад лячэння Ліхавіда: ён паскардзіўся на болі ў страўніку, аднак “лекар” сказаў, што той не хворы, бо... гучна размаўляе.

Пенітэнцыярную сістэму Беларусі былы палітвязень называе “адрыжкай ГУЛАГу”: “*Нічога не змянілася – можа, пайка стала лепш*”. Сітуацыю не выправяць, на ягонае перакананне, ні Дэпартамент выканання пакаранняў, ні Міністэрства ўнутраных спраў: “*Патрэбныя палітычныя пераўтварэнні ў цэлым па краіне*”.

“Зону” ён называе зрэзам грамадства, дзе адміністрацыя – улада, а зняволеныя – народ. Па словах Мікіты, тыя, з кім яму давялося знаходзіцца за кратамі, пераважна “*ў такіх слоўных абаротах выказваліся пра ўладу, што вушы ў трубачку скручваліся!*”.

У Мікіты Ліхавіда не барыкаднае мысленне.

На ягоны прагноз, Аляксандр Лукашэнка кіруе краінай свой апошні тэрмін.

«*Лукашэнка сыдзе, але ўжо цяпер трэба думаць, як перабудаваць краіну, каб не страціць яе ні ў сацыяльным плане, ні ў эканамічным, ні ў палітычным. Кожны дзень з Лукашэнка цяпер выльецца нам у тры дні карпатлівай цяжкай працы потым*», – лічыць актывіст.

# Аванс ад “Усходняга партнёрства”

**29-30 верасня ў Варшаве адбудзецца саміт “Усходняга партнёрства” – ініцыятывы ЕС у дачыненні да шасці постсавецкіх краін (Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грузіі, Малдовы і Украіны).**




Польшча, якая цяпер старшынюе ў другім паўгоддзі 2011 года ў Еўрасаюзе і курыруе праграму “Усходняе партнёрства”, запрасіла пасля доўгіх роздумаў на саміт і афіцыйны Мінск. Гэта будзе прадстаўнік МЗС Беларусі. Астатнія ўдзельнікі “УП” будуць прадстаўлены на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў.

Прэм’ер-міністр Польшчы Дональд Туск паведаміў, што на перамовах з канцлерам Германіі Ангелай Меркель знайшоў “*разуменне польскай канцэпцыі саміту” Усходняга партнёрства*”.

“*Схіляю лідараў Еўропы, а з Берлінам было некалькі цяжэй, каб пры супрацоўніцтве з беларускай апазіцыяй ствараць умовы для верагоднага ”круглага стала” ў Беларусі. Я праінфармаваў сваіх партнёраў у Еўропе, што мы будзем запрашаць на саміт “Усходняга партнёрства” прадстаўніка Беларусі на ўзроўні МЗС*”, – цытуе Дональда Туска польскае інфармацыйнае агенцтва PAP.

Па словах польскага прэм’ера, “*неабходны той элементарны кантакт з рэжымам, не для таго, каб адпусціць ім грахі, а для таго, каб інфармацыя аб тым, што мы хочам зрабіць у Беларусі, дайшла да высокага ўзроўню па магчымасці хутка. І, здаецца, скептыцызм Германіі таксама пераадолены*”.

Такім чынам, запрашэнне на саміт “Усходняга партнёрства” можна лічыць перадыялогавым авансам беларускім уладам. Еўропе ўсё-такі вельмі важна ўтрымаць нашу краіну ў рэчышчы палітыкі ўцягвання ў процівагу ўзмацненню ціску з боку Масквы.

На саміце плануецца прыняць дэкларацыю і абмеркаваць дарожную мапу – план узаемадзеяння з выразна прапісанымі абавязальніцтвамі.

Лідар Руху “За Свабоду” пракаментаваў рашэнне запрасіць на саміт “Усходняга партнёрства” 29-30 верасня ў Варшаве прадстаўніка афіцыйнага Мінска на ўзроўні МЗС такім чынам:

“*Удзел нашай краіны ва “Усходнім партнёрстве” неабходны перш за ўсё беларускаму грамадству. Ён вельмі важны і пры аўтарытарнай уладзе, і пры дэмакратычнай. Справа толькі ў фармаце і прадстаўнічасці. Таму што гэта крокі па ўмацаванні нашай незалежнасці, яны патрэбныя дзеля нашай палітычнай і эканамічнай мадэрнізацыі, дзеля еўрапейскай інтэграцыі. Уладзе сёння больш за ўсё мроіцца крэдыты – нам патрэбныя сістэмныя перамены*”.

“*На саміт не могуць быць запрошаныя людзі з улады, што знаходзяцца ў спісе чыноўнікаў, якім забаронены ўезд у ЕС. Але кантакты мусяць працягвацца на ўзроўні дастаткова высокім, каб Захад мог уплываць на сітуацыю ўнутры нашай краіны. У тым ліку для далейшага вызвалення палітвязняў. Адначасова ў межах “Усходняга партнёрства” ўжо паспяхова развіваецца дыялог з Бруселем грамадзянскай супольнасці Беларусі, што значна паскорыць трансфармацыю нашай дзяржавы пасля дэмантажу аўтарытарнай сістэмы*”, – адзначае лідар Руху “За Свабоду”.

# Добрыя беларусы (працяг)

**Пачатак на с.1**

“*Іншымі словамі, беларусы выказваюць сваё стаўленне да прадстаўнікоў іншых краін шмат у чым на падставе уласных назіранняў або, можна выказаць здагадку, на падставе аповедаў сваіх сяброў, родных і блізкіх, якія пабылі ў канкрэтных краінах. Гэта значыць, у аснове меркаванняў і меркаванняў гараджан нашай краіны рэальныя дзеянні прадстаўнікоў іншых краін і народаў адносна Беларусі. Дзеянні, якія і фармуюць ўзаемнае стаўленне*”, – кажуць сацыёлагі. Найбольш актыўнымі наведвальнікамі замежных краін з’яўляюцца грамадзяне Беларусі 18-49 гадоў, з вышэйшай адукацыяй.

Вынікі гэтага апытання – лішняе пацвярджэнне таго, што візавыя палёгкі беларусам з боку Еўрасаюза паспрыяюць імкліваму росту праеўрапейскіх настрояў беларусаў.

# Рублёвыя шпалеры



**Вядомы эканаміст Сяргей Чалы заявіў, што беларускія рублі, па вялікім рахунку, перасталі быць грашыма. “Гэта талончыкі на спажыванне”, – сказаў ён, выступаючы на канферэнцыі “Незалежнасць: дасягненні і перспектывы”, арганізаванай у рамках кампаніі “Народная праграма” Рухам “За Свабоду”.**

Па словах эксперта, калі пачытаць азначэнні грошай, то з асноўных іх функцый беларускія рублі выконваюць цяпер толькі адну – сродак плацяжу. Напрыклад, ні мерай кошту, ні інструментам для зберажэнняў, па словах **Сяргея Чалага**, *Br* не з’яўляюцца.

“*Ніхто ў думках, у галаве цэны ў беларускіх рублях не трымае. Гэта фізічна немагчыма пры інфляцыі каля 80%, якая будзе па выніках года. Нацыянальнай валютай даўно стала у.а, усе ўсё пералічваюць у долары – гэта прысуд беларускаму рублю*”, – заявіў Чалы.

“*Што такое грашовая сістэма? Гэта накшталт крывяноснай сістэмы арганізму. З 16 сакавіка наша эканоміка, гэты арганізм, знаходзіцца ў стане глыбокага інсульту. Не працуе практычна ніводны сегмент грашовага рынку. Дзеянні ўладаў, якія істэрычна спрабуюць латаць трышкаў кафтан, накіраваныя не ў бок рынку, а ў бок адміністрацыйных размеркавальных механізмаў. Гэта і на міжбанкаўскім рынку так, і на рынку наяўнай валюты, і нават на спажывецкім рынку*”, – кажа эканаміст.

*Ва ўладаў адсутнічае палітычная воля да прыняцця сур’ёзных рашэнняў*

Паводле яго слоў, ва ўладаў адсутнічае палітычная воля да прыняцця сур’ёзных рашэнняў. Аднак у сярэднетэрміновай перспектыве макраэканамічная раўнавага будзе адноўленая, упэўнены Чалы: “*Відаць, акрамя жадання ўлад, быць можа, катастрафічным чынам, але ўсё будзе добра. Можна колькі заўгодна мачыцца супраць ветру, гвалтаваць палітыкай эканоміку, але ўрэшце рэшт яна сваё возьме*”.

Эканаміст даў зразумець, што тады ў краіне будзе іншая ўлада. Ёй Сяргей Чалы прапанаваў свае паслугі ў якасці кіраўніка Нацбанка – “*чалавека, чый подпіс будзе стаяць на новых беларускіх грошах*”.

А яны павінны быць абавязкова з манетамі, лічыць Сяргей Чалы: “*Гэта важны эканамічны і псіхалагічны фактар. Сабекошт металічных грошай на парадак вышэй, чым папяровых. А то нашымі дзесяцірублёўкамі, як жартуюць у благасферы, танней абляпляць сцены, чымсьці шпалерамі. Сапраўды танней. А калі яшчэ ў Нацбанку неразрэзанымі аркушамі іх браць... Манеты – гэта сігнал дзяржавы насельніцтву, што за гэтыя грошы на працягу ўсяго тэрміну іх службы (а ён зноў жа больш працяглы, чым у папяровых) можна будзе нешта купіць. І хацелася б, каб на пытанне пра тое, за колькі чалавек купіў машыну, той называў кошт у нацыянальнай валюце*”.

Эканаміст выступае за тое, каб гэта быў талер.

# Салігорск багацейшы за Мінск

**Белстат апублікаваў памеры намінальных сярэдніх заробкаў у розных рэгіёнах Беларусі за перыяд са студзеня па ліпень.**

Такім чынам, Топ-10 (у лідарах рэгіёны з буйнымі прадпрыемствамі):

Салігорскі раён – 2 млн. 600 тысяч рублёў, Мінск – 2 млн. 99 тыс., Наваполацк 1 млн. 883 тыс., Жодзіна – 1 млн. 870 тыс., Мінскі раён – 1 млн. 815 тыс., Жлобінскі раён – 1 млн. 806 тыс., Гродна – 1 млн. 781 тыс., Рэчыцкі раён – 1 млн. 672 тыс., Брэст – 1 млн. 653 тыс., Мазырскі раён – 1 млн. 621 тыс.

Толькі ў Салігорскім раёне лічба блізкая да абяцаных Лукашэнкам 500 долараў у эквіваленце – калі лічыць, што праўда, па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка, які значна меней за рынкавы.

# Стварыы сімвал Еўраклуба

**Рух “За Свабоду” запрашае творчых людзей паўдзельнічаць у конкурсе на лепшы лагатып для заснаванай арганізацыяй сеткі Еўрапейскіх клубаў.**

Яны пачалі дзейнічаць у шэрагу беларускіх гарадоў і маюць на мэце папулярызацыю ідэяў еўрапейскай інтэграцыі Беларусі і стварэнне дыскусійных пляцовак для абмеркавання прапановаў па паляпшэнні сітуацыі ў Беларусі праз набліжэнне да еўрапейскіх стандартаў.

Асноўныя патрабаванні да лагатыпа:

1.Працы могуць быць выкананыя ў адвольнай тэхніцы і колеравай гаме, з магчымасцю іх наступнай мадыфікацыі, напрыклад, у пячатку ці элемент бланка.

2.Выявы лагатыпаў прымаюцца ў электронным выглядзе ў фармаце *.cdr *.jpg, а таксама ў выглядзе адсканаваных малюнкаў з іх абавязковым апісаннем.

3.Файлы з лагатыпамі не павінны перавышаць 5 Мб. Малюнак лагатыпа ў фармаце *.jpg мусіць мець памер, які дазваляе паўнавартасна ацаніць яго якасці (рэкамендаваны памер 1000-1600 пікселаў па большым баку).

4.Лагатып будзе выкарыстоўвацца Еўра-клубамі розных гарадоў, таму на выяве павінна быць месца для размяшчэння назвы горада.

5.Лагатып мусіць быць простым і лёгка пазнавальным.

Лагатып можа ўтрымліваць назву “Еўраклуб” альбо “Еўрапейскі клуб”. Колькасць работ ад аднаго ўдзельніка – неабмежаваная. Працы дасылайце, калі ласка, на электронную скрыню **euroclub.miensk@gmail.com**. У лісце пазначайце сваё імя і прозвішча, кантакты: e-mail, тэлефон. Лісты прымаюцца да 10 кастрычніка.

Аўтары найлепшых работ будуць адзначаныя прызамі. А пераможцу чакае грашовая ўзнагарода.

Арганізатары конкурса пакідаюць за сабой права далейшай публікацыі і размяшчэння конкурсных прац у сетцы інтэрнет у межах асветніцкай і іншай дзейнасці з пазначэннем імя аўтара.

КАДРЫ ТЫДНЯ



NAVINY.BY



EX-PRESS.BY

**Кошты ў Беларусі сарваліся з ланцуга, уражваючы, а то і ўганяючы народ у шок. Вось, напрыклад, каўбасы. “Волатаўская” – наогул па сапраўды волатаўскім кошце вышэй за 100 тысяч рублёў, альбо кумпяк за 400 тысяч!**

# Рэцэпт супраць страху

**Абвешчаны новы конкурс кампаніі “Страху няма!”, якую ладзіць кааліцыя “Беларускі выбар” (Рух “За Свабоду!”, Партыя БНФ, Партыя “Зялёныя”, Саюз “За мадэрнізацыю”, аргкамітэт па стварэнні Партыі свабоды і прагрэсу.**

Ён праводзіцца на лепшую пісьмовую працу, стымулюючую пазбаўленне людзей ад страху, які так моцна ўкараняе кіруючы рэжым.

Наша галоўная зброя – слова!

У межах конкурса гэта можа быць артыкул, эсэ, нататка – што заўгодна. Дасылайце свае працы да 20 кастрычніка на e-mail: **strahu.niama@gmail.com**.

Гэта рэальны шанец на ўласны ўнёсак у справу разняволення і вызвалення Беларусі! Вызваленне ад страху, які замінае нам жыць!

Журы вызначыць лепшыя працы, якія будуць прадстаўленыя ў спецыяльным зборніку, выдадзеным кампаніяй “Страху няма!”, і адзначаныя карыснымі і сімвалічнымі падарункамі.

Газета выдаецца Рухам “За Свабоду”. Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна. Падпісана ў друк 26.09.2011 г. Кантакты Рэдакцыі: тэлефон: 2808863, е-пошта: info@pyx.by